Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 35 (104)
ПАНЯДЗЕЛАК
12
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

КУЛЬТУРА РАБОТЫ СОВЕТСКОГО УЧРЕЖДЕНИЯ

Наше социалистическое государство—самое демократическое в мире. Советская власть—подлинно народная власть. Она вышла из народа, подняла к управлению государством лучших представителей народа и тысячами нитей тесно связана с широкими трудовыми массами. Советский государственный аппарат должен быть самым простым и самым четким механизмом управления, работающим, как часы. Твердый порядок в каждом советском учреждении, деловитость, чуткость и внимательность к людям—вот отличительная черта, характеризующая советскую систему управления.

В декабре 1918 года, когда молодая республика Советов еще только становилась на ноги, Ленин пишет «Набросок правил об управлении советскими учреждениями». Ленин требует «самой точной **ответственности каждого** из состоящих на любой Советской должности лиц за **выполнение определенных**, ясно и недвусмысленно очерченных, заданий и **практических** работ». Ленин предлагает перестроить работу всех руководящих советских учреждений таким образом, чтобы «на первое место встал фактический контроль за действительным осуществлением постановлений центральной власти и местных учреждений...».

Ленин в своем «Наброске» кропотливо вникает в мелочи работы, он дает конкретные, точные указания, как наладить порядок в советских учреждениях: «в каждом советском учреждении на видном месте должны быть вывешены правила о днях и часах приема публики; допуск в помещение для приема должен быть свободным, без всяких пропусков; часы приема следует установить и в воскресные и праздничные дни; надо завести книгу для записи в самой краткой форме имени посетителя, сущности его жалобы и направления дела и т. д.

С тех пор, как Лениным написаны эти строки, прошел 21 год. Сломав старую бюрократическую машину помещичье-капиталистического государства, служившую эксплоататорам для угнетения и порабощения трудового народа, рабочий класс нашей страны, руководимый партией Ленина — Сталина, создал могучее советское государство, наладил и укрепил свой государственный аппарат. За 22 года советской власти коренным образом перестроена вся страна, ликвидировано тягчайшее бремя той культурной неразвитости народа, которая досталась нам в наследство от старого строя. В государственный аппарат пришли новые, советские люди, вырос огромный круг советских государственных деятелей, советских руководителей, советских работников, которые успешно овладевают сложным искусством управления государством. Сбылась ленинская мечта — у государственного руля стали и женщины. И уже не кухарка управляет государством, нет — кухарка за годы советской власти прошла огромную политическую школу, окончила советский вуз, стала образованным человеком, государственным деятелем. Новые люди в корне изменили наш государственный аппарат, он стал гораздо четче, налаженнее, продуктивнее работать.

Однако далеко еще не всё образцово в наших советских учреждениях. Ленинские указания о работе аппарата злободневны и сейчас. Ибо немало еще у нас учреждений, где нет должного внимания к нуждам людей, где живут еще бюрократизм, обезличка, функционалка. Борьба за культуру советского учреждения, за культуру управления не должна сходить с повестки дня наших советских, партийных и других общественных организаций.

Разве мало наберется у нас учреждений, где нет регламентации работы каждого служащего, нет культуры труда, борьбы за уплотнение рабочего дня, учреждений с разбухшими, ненужными штатами, учреждений, подчас дублирующих друг друга? Немало еще осталось в наших учреждениях косности, немало охотников работать постаринке, любителей «завязывать и развязывать узелки». Многочисленные письма советских служащих, поступающие в «Правду», показывают, что сами служащие начали борьбу за культурный, четкий советский аппарат, и их инициативу надо всемерно поддержать. Ликвидация дублирующих друг друга учреждений, устранение надуманных должностей, уплотнение рабочего дня служащих, точное определение функций каждого,—вот тот путь, который освободит немало лишних рук, таких дорогих и дефицитных в советской стране, предъявляющей огромный спрос на квалифицированный труд.

Разве мало учреждений, где крепко укоренилась практика бесконечных заседаний с утра до ночи и с вечера до утра, заседаний до одури, до головной боли? Проводить заседания деловито, ликвидировать болтовню, приучать выступающих кратко и четко формулировать мысли, укладывать заседания в точный срок — вот тот стиль, который надо всячески прививать в нашей работе.

Немало еще учреждений (в том числе и партийных), где безобразно поставлены прием посетителей, отношение к письмам трудящихся. Посетители подчас не могут получить на свои запросы, жалобы, заявления толкового, вразумительного ответа. Вместо того, чтобы быстро и четко разрешить заслуживающую уважения просьбу, многие работники уклоняются от ответственности, затевают канитель бесконечных «увязываний», ненужных согласований, затягивая разрешение дела надолго. Есть и другое явление. Немало у нас в учреждениях сидит «добреньких» и «стыдливых» людей, которые стесняются прямо отказать в том случае, если просьба не заслуживает удовлетворения, отсылают посетителей от Понтия к Пилату, вместе того, чтобы честно и прямо ему отказать и об'яснить мотивы отказа.

У многих работников наших учреждений не привилось еще внимательное отношение к письмам трудящихся. Часто не понимают наши работники, что ответить на письмо — элементарный долг, элементарная вежливость каждого советского гражданина, тем паче работника советского учреждения. Культура работы заключается и в том, чтобы ответить на каждое письмо, сообщить, что сделано по письму, куда оно направлено, или, если просьбу удовлетворить нельзя, то почему.


Нечего и говорить о том, что четкий порядок в учреждении требует того, чтобы в помещении было чисто, опрятно, уютно. А у нас немало учреждений, которые захламлены, загрязнены, полы в них не мыты, стены обшарпаны, для посетителей не предусмотрены элементарные удобства, не на чем посидеть, нет воды для питья и т. д. Руководители учреждений в таких случаях любят ссылаться: слишком много бывает посетителей, невозможно поддерживать чистоту. Чепуха! Именно те учреждения, где бывает много народу, надо содержать в образцовой чистоте. Больше всего людей бывает в метро, а какая здесь чистота! Метро приучило своих посетителей вести себя культурно. Каждое советское учреждение обязано делать так же. Особенно это относится к району, к селу. Поставьте урны для бумаг, окурков, постелите дорожки в коридорах, комнатах, и каждый приходящий колхозник с уважением будет относиться к чистоте, поддерживать ее.

Есть еще немало у нас руководителей-коммунистов, которые стараются все делать сами, хватаются за двадцать дел и не кончают ни одного. Не браться самому за все дела, а уметь распределять работу, давать поручения и самому проверять работу аппарата, — вот стиль культурной, большевистской работы.

Ленин и Сталин учат, что гвоздь работы — в подборе людей и в проверке исполнения. Люди у нас есть, люди прекрасные, их надо только выдвигать, ставить на место, и если они еще не привыкли как следует работать, приучить их к точности, аккуратности, деловитости в работе.

Всем нашим советским, партийным, профессиональным организациям надо внедрять навыки культурной работы, помня, что именно они — эти навыки— одна из отличительных черт политических деятелей ленинско-сталинского типа.

(Передовая «Правды»).



На снимке: заместитель политрука тов. И. Г. Танилин готовится к проведению политинформации.

Фото Б. Ярославцева.

Накануне XXII годовщины РККА

ОБОРОННАЯ РАБОТА СРЕДИ НАСЕЛЕНИЯ

В связи с XXII годовщиной Красной Армии население гор. Белостока проявляет огромный интерес к оборонной работе.

По предприятиям города за последние дни создано 12 первичных организаций Осоавиахима, в которые уже поступило более 500 заявлений о приеме в члены. 60 таких заявлений подано в осоавиахимовскую организацию текстильного комбината № 4. Осоавиахимовцы фабрики № 13 и комбината № 5 организуют у себя оборонные кружки по изучению винтовки и гранаты. Руководство кружками взяли шефы предприятий—бойцы и командиры воинских частей.

С каждым днем растут и активизируются организации спортивных обществ. В честь годовщины Красной Армии спортивные общества примут участие во всебелорусском звездном пробеге мотоциклистов с лыжниками на буксире. 21 февраля состоится собрание допризывников города.

МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Днямі чырвонаармейскі калектыў мастацкай самадзейнасці часці, дзе камісарам тав. Оленін, даў для мясцовага насельніцтва канцэрт. Гледачы засталіся вельмі задаволены. Асабліва спадабалася ім майстэрства тав. Баранава і Дзеньга, якія выканалі песні і частушкі з кінофільма „Волга-Волга“. Жаночы хор выканаў рад песень совецкіх кампазітараў.

Камсамольцы часці, дзе камісарам тав. Ляпін, для насельніцтва арганізавалі два вечары чырвонаармейскай самадзейнасці.

Малодшы камандзір **С. Куцаеў.**

ОПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 10 лютага на фронце не адбылося нічога істотнага.

Наша авіяцыя рабіла разведчыя і баявыя палёты.

Падрыхтоўка да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР

У новым раёне

Парэчча. У сёлах і вёсках Парэцкага раёна наглядаецца небывалы палітычны і вытворчы ўздым.

Зараз тут скончана работа па ўкамплектаванню ўчастковых выбарчых камісій і падбору памяшканняў. Створана 23 выбарчых участкі. Для іх падабраны лепшыя памяшканні. У Друскеніках выбарчы участак змяшчаецца ў клубе, у Парэччы—у школе.

Для правядзення і кіраўніцтва агітацыйна-масавай работай на ўчастках райком КП(б)Б арганізаваў 23 агіткалектывы. Іх кіраўнікамі зацверджаны лепшыя прапагандысты. Агіткалектывы прыступілі да работы. Вакол іх з кожным днём расце актыў сялян і інтэлігенцыі.

Днямі ў Парэччы адбылася нарада па пытаннях складання спіскаў выбаршчыкаў. Пасля нарады 85 правераных актывістаў выехалі на раён для ўдакладнення спіскаў выбаршчыкаў.

Звыш 400 чалавек агітатараў, бяседчыкаў, членаў акруговых і ўчастковых выбарчых камісій прыступілі да актыўнай работы. У вёсках створаны 24 гурткі па вывучэнню Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. У іх займаецца звыш 500 чалавек. Лік гурткоў расце з кожным днём. Праводзяцца кансультацыі і семінары для агітатараў і бяседчыкаў, на якіх праходзіць абмен вопытам работы і вывучэнне выбарчай літаратуры.

Комсамолка тав. Новікава ў вёсцы Парэчча арганізавала гурток выбаршчыкаў. Сярод наведвальнікаў гуртка многа жанчын. Простыя і даходлівыя гутаркі Новікавай прыходзяць слухаць дзесяткі мужчын і жанчын. Зараз у вёсцы абсталёўваецца выбарчы ўчастак, рыхтуюцца лозунгі, плакаты, дыяграмы. У вёсцы Гадуны шырока вядома імя Пудлоўскага Паліта. На занятках гуртка ён на канкрэтных прыкладах паказвае перамены, якія адбыліся ў жыцці працоўных заходніх абласцей Беларусі, расказвае аб перамогах соцыялізма ў СССР.

Агітатары тт. Улдукіс, Кавалёў, Суравец і іншыя ў сваёй прапагандысцкай рабоце нядрэнна скарыстоўваюць яркія факты з жыцця раёна. У раённым цэнтры адкрыт Дом соцкультуры, клуб чыгуначнікаў, аптэка, амбулаторыя, магазін і сталоўка. Ва ўсіх вёсках адкрыты школы і ў большасці вёсак — бальніцы і медпункты.

Да недахопаў работы па падрыхтоўцы да выбараў неабходна аднесці недахоп выбарчай літаратуры. Гродненскія магазіны культтавараў не клапаціліся своечасова завезці выбарчую літаратуру ў вёскі.

В. Гарбачёў.

Агітатары ў вёсцы

У вёсках Гродненскага раёна працуе больш 600 агітатараў і прапагандыстаў. Акрамя вывучэння выбарчага закона, яны праводзяць многалікія гутаркі, у часе якіх на канкрэтных прыкладах расказваюць аб росквіце і магутнасці нашай радзімы.

Селянін Кузнецкай воласці т. Юргель у сваёй вёсцы арганізаваў гурток, у якім рэгулярна займаецца 60—70 чалавек. У гуртку вывучаецца Сталінская Канстытуцыя. Пасля заняткаў т. Юргель праводзіць чыткі газет, гутаркі аб бягучай палітыцы, аб жыцці рабочых і сялян Совецкага Саюза.

Актыўным агітатарам з'яўляецца селянін-бядняк вёскі Капанькі т. Капецкі. Па яго ініцыятыве ў вёсцы арганізаван гурток па вывучэнню канстытуцыі і выбарчага закона. На занятках ён расказвае аб поспехах калгасаў і аб тым, што гэтыя поспехі з'яўляюцца рэзультатам самаадданай, чэснай працы калгаснікаў.

Гродненскі.

Нарада выбарчага актыва

Днямі ў гаркоме КП(б)Б гор. Беластока адбылася нарада старшынь і сакратароў акруговых і ўчастковых камісій. На нарадзе прадстаўнікі выбарчых камісій абмяняліся вопытам сваёй работы.

Лепш ідзе падрыхтоўка да выбараў у Чыгуначнай акрузе. Тут правялі семінар для агітатараў, якім ахапілі 30 чалавек.

Тав. Крыштафовіч, старшыня выбарчай камісіі Фабрычнай акругі, у сваім выступленні востра крытыкаваў тых членаў выбарчых камісій, якія адрываюцца ад сваіх участкаў, матывуючы гэта занятасцю на асноўнай рабоце.

Цэнтр увагі ў выбарчай кампаніі павінен знаходзіцца па ўчастку. Таму важна падабраць для ўчасткаў утульныя і прасторныя памяшканні, у якіх было-б магчыма праводзіць сходы і гутаркі з выбаршчыкамі. Патрэбна ўпрыгожыць іх, каб участкі прыцягвалі насельніцтва да сябе. Між тым пытанне аб памяшканнях пад участкі яшчэ далёка не вырашана горвыканкомам. Рад выбарчых участкаў у Фабрычнай і Чыгуначнай акругах не маюць памяшканняў.

Тав. Гершман у заключнай прамове звярнуў увагу на неабходнасць сталага інструктажу не толькі агітатараў, але і ўсяго выбарчага актыва. Неабходна памятаць, што ва ўмовах абвостранай класавай барацьбы палітычная падрыхтоўка выбарчага актыва мае вялікае значэнне.

В. Найдус.

Расце прадукцыйнасць працы

Аўгустова. (Па тэлефону). Рабочыя лесазавода „Нетто“ сустракаюць выбарчую кампанію новымі вытворчымі поспехамі. Паспяхова выконваецца вытворчы план. Па ініцыятыве самых рабочых заключан дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва з другім лесазаводам. За апошні месяц прадукцыйнасць працы ўзрасла на 10—12 проц. Перадавыя рабочыя Яхніч і Васілеўскі распілоўваюць па 35—40 кубаметраў драўніны ў дзень, замест нормы 30 кубаметраў.

Шулейка.

Подготовка к выборам руководящих партийных органов

С 15 февраля по 15 марта будут проходить выборы руководящих партийных органов. В течение месяца состоятся отчетно-выборные собрания первичных парторганизаций, районные, городские, областные и краевые партконференции, с'езды компартий союзных республик.

Началась подготовка к выборам в Алма-атинской городской парторганизации. 8 февраля в райкомах состоялись совещания секретарей партбюро и первичных парторганизаций, обсудившие задачи выборов и планы проведения отчетно - выборных партийных собраний. 15 февраля начнутся отчетно - выборные собрания в первичных партийных организациях. С 23 по 28 февраля будут проходить районные партийные конференции. Городскую партийную конференцию намечено провести 29 февраля.

Алтайский райком ВКП(б) постановил провести отчетно-выборные собрания первичных парторганизаций с 15 по 25 февраля. Районные партсобрания и конференции решено провести с 25 февраля по 5 марта. Созыв краевой партийной конференции намечен на 11 марта.

Подготовка к выборам руководящих партийных органов проводится под знаком проверки выполнения решений XVIII с'езда ВКП(б).

Состоялось совещание секретарей горкомов и райкомов партии, посвященное обсуждению вопросов, связанных с подготовкой к выборам руководящих партийных органов.

З'яднанне беларускага народа

П. ПАНАМАРЭНКА

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі

Калі ў 1922 годзе рашалася пытанне аб аб'яднанні ўсіх савецкіх рэспублік у адну саюзную дзяржаву — СССР, — таварыш Сталін гаварыў:

«Ці-ж гэта не здзіўляюча, што там, на Захадзе, у свеце буржуазнай дэмакратыі, мы маем справу з паступовым разлажэннем і заняпадам многанацыянальных дзяржаў на састаўныя часткі (накшталт Вялікабрытаніі, якая, не ведаю, як яна ўладзіць справу з Індыяй, Егіптам, Ірландыяй, або накшталт Польшчы, якая, зноў-жа не ведаю, як яна ўладзіць справу з сваімі беларусамі, украінцамі, немцамі, яўрэямі), а тут у нашай федэрацыі, аб'ядноўваючай не менш 30 нацыянальнасцей, тут, наадварот, мы маем справу з працэсам умацавання дзяржаўных сувязей паміж незалежнымі рэспублікамі, з працэсам, вядучым да ўсё больш цеснага збліжэння незалежных нацыянальнасцей у адну незалежную дзяржаву! Вось вам два тыпы дзяржаўных аб'яднанняў, з якіх першы тып, капіталістычны, вядзе да развалу састаўных частак дзяржавы, а другі тып, савецкі, вядзе, наадварот, да паступовага, але моцнага збліжэння раней незалежных нацыянальнасцей у адну незалежную дзяржаву» (І. Сталін, «Марксізм і нацыянальна-каланіяльнае пытанне», стар. 93).

Гістарычныя падзеі поўнасцю пацвердзілі правільнасць гэтых вывадаў таварыша Сталіна. Многанацыянальная савецкая дзяржава пераможна прайшла скрозь усе гістарычныя выпрабаванні. Яна ўстанавілася як непахісны аплот соцыялізма, як увасабленне непарушнай дружбы і еднання народаў. Многанацыянальныя-ж буржуазныя дзяржавы раздзіраюцца ўнутранымі, непрымірымымі супярэчнасцямі. У рэзультаце гэтых супярэчнасцей на нашых вачах у некалькі дзён загінула панская Польшча.

З самага пачатку свайго існавання панская Польшча стала турмой народаў. Правячыя класы Польшчы нічаму не навучыліся на прыкладах крушэння многанацыянальных капіталістычных дзяржаў. Наадварот, яны з асобай стараннасцю вывучалі іх метады каланіяльнага разбою, эксплаатацыі і нацыянальнага прыгнечання і прымянялі іх у адносінах няпольскіх нацыянальнасцей, у асаблівасці ў адносінах да беларусаў і украінцаў.

Узнікшая на руінах пасляваеннай Еўропы па волі пераможцаў у першай імперыялістычнай вайне панская Польшча адразу-ж узяла на сябе ролю апрычніка англа-французскага імперыялізма ў барацьбе супроць Савецкай краіны. Гэтая роля адпавядала і ўласным імперыялістычным накіраванням польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Абураваемая сваёй так званай цывілізатарскай місіяй на ўсходзе Еўропы, Польшча, гэты, па выражэнню Леніна, ублюдак дзяржавы, усю сілу сваіх «цывілізатарскіх» прыёмаў абрушыла на народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Правячыя кругі Польшчы вельмі добра ведалі, што яе палітыка нацыянальнага прыгнечання выклікае нянавісць у беларускіх і украінскіх рабочых і сялян да польскіх паноў-прыгнятальнікаў. Таму гэта паны і былі так неспакойны ў адносінах «усходніх крэсаў», як яны называлі Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Былы польскі міністр Вітос прама і недвухсэнсоўна гаварыў: «Нашы спрэчкі з Расіяй аб усходніх землях выклікалі 15 войн і 3 паўстанні, і яны яшчэ не вырашаны, і вырашыць іх можна толькі па двух напрамках — каланізацыяй усходніх зямель польскімі элементамі і асіміліраваннем».

Каланізацыя польскімі нацыяналістычнымі элементамі Заходняй Беларусі і спробы асіміліравання, знішчэння нацыянальных асаблівасцей беларускага насельніцтва і былі асноўнымі элементамі палітыкі польскай дзяржавы ў адносінах да Заходняй Беларусі. Імкненне зрабіць Заходнюю Беларусь аграрным прыдаткам цэнтральнай Польшчы, упаўне і ва ўсім залежачым ад яе, эканамічнае абрабленне рабочых і працоўных сялян і бязлітаснае падаўленне рэвалюцыйнага руху сярод іх, разгром рэвалюцыйных арганізацый, забарона роднай мовы, разгром культурных устаноў беларусаў, зверскія карныя экспедыцыі ў адказ на малейшыя праяўленні сімпатый да рускіх, да Савецкага Саюза, канцэнтрацыйныя лагеры і турмы — вось сродкі «цывілізацыі» і далучэння да польскай культуры «ўсходніх крэсаў».

Велізарныя натуральныя багацці Заходняй Беларусі драпежніцка эксплаатаваліся капіталістамі і памешчыкамі. Сыравіна вывозілася ў цэнтральную Польшчу. На Заходнюю Беларусь у 1934 годзе прыходзіўся ўсяго 1 проц. выпрацоўваемай у Польшчы электраэнергіі, а ў 1938 годзе—толькі поўпроцанта. Тут не толькі не дапускалася ніякага прамысловага будаўніцтва, наадварот, існаваўшая прамысловасць усяляк удушалася.

Цэлы рад прамысловых галін, як скураная, запалкавая і іншыя, быў амаль зусім ліквідаван. Больш палавіны тэкстыльнай прамысловасці Беластока было разбурана. З існаваўшых 200 тэкстыльных прадпрыемстваў засталося 83, а колькасць рабочых на тэкстыльных фабрыках скарацілася амаль на 70 проц. у параўнанні з 1913 годам.

Пазбавіўшы Заходнюю Беларусь якога-б та ні было прамысловага развіцця, польскія правіцелі імкнуліся ператварыць яе ў рынак збыту і ў пастаўшчыка таннай сыравіны і танных рабочых рук для польскай прамысловасці.

Становішча рабочых у Заходняй Беларусі было немагчыма цяжкім.

Аб жыццёвым узроўні польскіх рабочых польскі прафесар Кржывіцкі пісаў: «Калі мы хацелі-б знайсці краіну, найбольш блізкую па структуры рабочага бюджэта да нашай краіны, то, як-бы гэта ні здавалася парадаксальным, — гэта бюджэт індускага рабочага ў Бамбеі». А становішча рабочых Заходняй Беларусі было ўдвая цяжкім, бо беларускі рабочы атрымліваў заработную плату на 15—65 проц. ніжэй заработнай платы польскіх рабочых у Варшаве. Адсутнічалі самыя элементарныя меры па ахове працы. Рабочы дзень быў па сутнасці не абмежаван і, як правіла, даходзіў да 12 і нават 14 гадзін. Да ўсяго гэтага пастаянная пагроза быць выкінутым на вуліцу.

Працоўнае сялянства Заходняй Беларусі бязлітасна эксплаатавалі, прыгняталі памешчыкі, асаднікі, дзяржаўныя чыноўнікі і кулакі. У Заходняй Беларусі памешчыкі захвацілі палавіну ўсёй зямлі, а, напрыклад, у Палескай вобласці — каля трох чвэртак. 85 процантаў лясоў належала памешчыкам і дзяржаве, астатнія 15 процантаў — кулакам. Памешчыкі захвацілі амаль усе лугі і выпасы для жывёлы.

Пазбаўлены зямлі і жывёлы, селянін пападаў у бязвыхадную кабалу да памешчыка, да асадніка і кулака. Прыгонніцкі перажытак — адработкі — меў паўсямеснае распаўсюджанне. Селянін адпрацоўваў за ўсё: за пасьбішча, за лес, за арэнду зямлі, за штрафы. Адработкі даходзілі да 100 дзён у год. 80 процантаў вясковага насельніцтва цягнулі жабрацкае існаванне. Пулаўскі сельскагаспадарчы інстытут падлічыў, што дзённыя выдаткі на аднаго дарослага чалавека ў цэнтральнай Польшчы складалі 12 грошаў у дзень, а ў Заходняй Беларусі — усяго 4 грошы.

Падаткі, якія падалі на сялянства (пазямельны, ураўніцельны, царкоўны, дарожны, падаходны і іншыя, іх налічвалася звыш 70), аднімалі ў селяніна 40—50 проц. валавога даходу. Акрамя таго, селяніна грабілі і як пакупніка. Селянін вымушан быў плаціць, напрыклад, гандлярам за 1 кілограм солі 3 кілограмы жыта, або за 1 каробку запалак — больш літра малака.

Асобае месца ў праводзенні польскай каланізатарскай палітыкі ў Заходняй Беларусі займала ваеннае асадніцтва. Наўрад ці можна было знайсці што-небудзь больш ненавіснае для заходнебеларускага селяніна, чым асаднік. Асаднікі захвацілі ў сялянства, і без таго ўжо абрабленага памешчыкамі, сотні тысяч гектараў лепшых зямель. Асаднікі, навербаваныя з былых легіянераў — удзельнікаў савецка-польскай вайны 1920 года—з'яўляліся непасрэднымі супрацоўнікамі польскай ахранкі і кулацкіх дружын, створаных для падаўлення рэвалюцыйных выступленняў сялян і спаймання іх кіраўнікоў, для зверскай расправы з сялянамі за праяўленне малейшай нелаяльнасці да польскіх устаноў або афіцыяльных асоб. Асаднікі, гэтыя душыцелі вызваленчай барацьбы працоўных мас, поўнасцю вызваляліся ад падаходна-маёмаснага і іншых падаткаў і павіннасцей, якімі бязлітасна давілі беларускіх сялян. Такі асаднік, які рассеўся на хутары ў 40—50 дзесяцін лепшай зямлі, захвачанай у сялян, атрымаў безвазротна субсідыі дзяржавы на набыццё жывёлы і абзавядзенне будоўлямі і інвентаром, карыстаецца дармовай батрацкай працай, выхоўваў сваіх дзяцей у духу нянавісці да народа, з'яўляўся найбольш зверскім эксплаататарам сялянства.

Сяляне вялі бесперапынную барацьбу супроць сваіх злейшых ворагаў—асаднікаў. Гэта барацьба мела самыя разнастайныя праяўленні, ад байкота да разгрому іх маёнткаў. Нават «Газета варшавска» вымушана была прызнаць, што многія асаднікі «згусціўшайся атмасферы на крэсах не маглі вытрымаць» і ўцяклі назад у Польшчу.

Народы Заходняй Беларусі, задаўленыя эксплаатацыяй, падвяргаліся жорсткаму нацыянальнаму прыгнёту, былі пазбаўлены ўсякіх палітычных правоў.

Увесь дзяржаўны апарат быў аддан у рукі нязначнай польскай меншасці, няпольскія нацыянальнасці не мелі права займаць якія-небудзь пасады ў дзяржаўным апараце. Усякая мова, акрамя польскай, была забаронена ва ўсіх установах, у школе і нават у прыватным жыцці. Поўнасцю былі ліквідаваны школы на беларускай мове. Настаўнікі-беларусы былі выгнаны са школ, і многія з іх падвяргаліся рэпрэсіям.

Праводзенне гнуснай палітыкі гвалтоўнага апалячання было афіцыяльнай лініяй улад, школы, царквы і суда.

Цяжкім ва ўсіх адносінах было становішча яўрэйскага насельніцтва Заходняй Беларусі. Пагромы адабраліся афіцыяльна. У буйнейшым горадзе Заходняй Беларусі—Беластоку—у адносінах да яўрэяў праводзілася такая-ж лінія, як у адносінах неграў у ЗША: асобыя школы, крамы, сталовыя, бані. Нават хаджэнне па некаторых вуліцах для яўрэяў было пад забаронай. Яўрэйская бедната не мела магчымасці атрымаць работу і тым самым асуджалася на голад і выміранне. Пастаяннае распальванне нацыянальнай розні, распальванне польскага шавінізма выклікала абвастрэнне і яўрэйскага нацыяналізма, асабліва ў дробнабуржуазным асяроддзі. Контррэвалюцыйная буржуазна-нацыяналістычная палітыка такіх партый, як Бунд, Паалейцыён і ім падобныя, у велізарнай ступені садзейнічала ажыццяўленню намераў каланізатараў, якія ўсімі мерамі дабіваліся раз'яднання працоўных розных нацыянальнасцей.

Метадам бязлітаснай эксплаатацыі, разбою, жорсткіх паліцэйска-карных экспедыцый і ўдушэння беларускай культуры польскія правіцелі на працягу дваццаці год дабіваліся «пацыфікацыі»—уціхамірання беларусаў, імкнуліся пазбавіць беларусаў іх нацыянальнай самасвядомасці, дабіваліся таго, каб былі забыты беларуская мова і культура, імкнуліся парваць сувязі беларускага народа з вялікім рускім народам і вытравіць сімпатыі да гэтага народа, імкнуліся стварыць з беларусаў паслухмяных і пакорлівых рабоў польскай памешчыцка-капіталістычнай дзяржавы.

Усяму свету ясна зараз, чаго дабіліся польскія заправілы ў рэзультаце гэтай палітыкі.

У нашым распараджэнні знаходзіцца дакумент—дакладная запіска былога ваяводы Беластоцкага ваяводства Генрыха Осташэўскага ў палітычны дэпартамент міністэрства ўнутраных спраў ад 23 ліпеня 1939 года за № 58/39. Запіска носіць недвухсэнсоўны загаловак: «Праблемы ўмацавання польскага панавання ў Беластоцкім ваяводстве». Запіска паявілася ў свет у рэзультаце праведзенага ў 1939 годзе ўпраўленнем ваяводы абследвання беларускай вёскі і горада з пункту гледжання праверкі «поспехаў» польскай палітыкі каналізацыі і асіміляцыі. На справе абследвальнікі лішні рез відавочна пераканаліся ў тым, што польскі ўплыў—гэта міф, пераканаліся ў тым, што польскіх каланізатараў ненавідзяць усюды—і ў горадзе і ў вёсцы. Ахоплены страхам перад надыходзячай катастрофай, у жаху перад усеагульным гневам народа, ваявода б'е трывогу, піша ў Варшаву. Вось старонкі яго запіскі:

«...Беларусы—ёсць этнічная група насельніцтва, асеўшая на зямлі і звязаная з ёю. Працэс асіміляцыі, аб якім можа быць гутарка, калі гаварылі аб умацаванні польскага ўладаючага становішча на гэтым участку, з часу аднаўлення Рэчы Паспалітай не дасягнуў значных рэзультатаў. Свядома беларускі элемент садзейнічае руху прарускай арыентацыі. У першым радзе стаяць тут даваенныя рускія сімпатыі. Замест іх мы павінны выпрацаваць сімпатыі да Польшчы. Польскія элементы не паспелі да гэтага часу не толькі ахваціць і павесці за сабой, але і нават звязацца з беларускай вёскай».

Далей ваявода піша аб становішчы ў гарадах:

«...Катастрафічнае становішча з польскім панаваннем у гарадах і мястэчках дыктуе неабходнасць прыняцця быстрых і радыкальных мерапрыемстваў».

Або, напрыклад, ён піша аб настроях яўрэяў:

«...Яўрэі, якія знаходзяцца ў границы Беластоцкага ваяводства і асабліва ва ўсходніх паветах, складаюць спецыяльны тып яўрэяў, так званых «літвакоў». За выключэннем агульных сувязей доўгага часу з намі «літвакі» не змаглі далучыцца да дзяржаўнасці і да польскай культуры. Яны карыстаюцца да сёнешняга дня рускай мовай і складаюць пераважна разбураючы элемент (дэканструкцыйны), або ў лепшым выпадку раўнадушны да польскай дзяржаўнасці».

Ваявода Осташэўскі, седзячы на вулкане, як відаць, згубіў усякае пачуццё рэальнага. Ён памышляе аб захаванні «ўладаючага становішча» любой цаной. Па яго думцы, для гэтага патрэбна «не так многа». Ваявода прапаноўваў:

«...Выражаючыся коратка, нашы адносіны да беларусаў могуць быць выражаны так, што мы жадаем аднаго, настойліва патрабуем, каб гэта нацыянальная меншасць думала па-польску, нічога яму ўзамен гэтага не даваць, і нічога не рабіць у іншым напрамку. Жадаючы, аднак, гэты працэс паскорыць, інакш гэта можа павесці да паяўлення розных непаразуменняў, мы павінны перамагчы старажытную беларускую культуру».

Сумны вынік падвёў ваявода 20-гадоваму панаванню Польшчы: не ўмацаванне «польскага ўладаючага становішча ва ўсходніх крэсах», як гэтага хацелася-б ваяводзе і ўсёй правячай клікі, а крах ідыёцкай антынароднай палітыкі польскіх уладароў і ўсеагульнае азлабленне супроць прыгнятальнікаў.

Польска-германская вайна з усёй відавочнасцю паказала ўнутраную нядзольнасць многанацыянальнай польскай дзяржавы. Польшча пацярпела бяспрыкладнае ваеннае паражэнне. Польская дзяржава ў небывала кароткі тэрмін распалася, перастала існаваць.

Такі маланкападобны развал дзяржавы з'яўляецца вынікам той грубай драпежніцкай эксплаатацыі, якую правячыя кругі Польшчы праводзілі ў адносінах да украінцаў, беларусаў, яўрэяў і т. д. Польскія правіцелі, зацеяўшыя вайну, не знайшлі ніякай апоры ў народзе.

Савецкі народ працягнуў руку дапамогі братам Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі і вывеў іх з кашмару вайны, з-пад прыгнёту эксплаатацыі польскіх памешчыкаў і капіталістаў. З дапамогай вялікага народа Краіны советаў, з дапамогай гераічнай Чырвонай Арміі працоўныя «ўсходніх крэсаў» былой панскай Польшчы знішчылі ўладу польскіх памешчыкаў і капіталістаў, знішчылі каланіяльнае прыгнятанне і эксплаатацыю, нацыянальнае прыгнечанне і палітычнае бяспраўе.

Народнае Сабранне Заходняй Беларусі, выражаючы волю ўсяго народа, маючы перад сабой вялікі прыклад Савецкага Саюза і горкі вопыт свайго жыцця, аднадушна дэкларыравала ўстанаўленне на тэрыторыі Заходняй Беларусі савецкай улады, як адзінай сапраўды народнай улады, з'яднанне з адзінакроўным народам Савецкай Беларусі і ўваходжанне ў Саюз Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік, канфіскацыю памешчыцкіх зямель, нацыяналізацыю банкаў і буйнай прамысловасці.

* * *

У заходніх абласцях Савецкай Беларусі разгарнулася каласальная творчая работа ва ўсіх галінах вытворчасці, на транспарце, у сельскай гаспадарцы, у галіне навукі і культуры. Сотні тысяч сялян і рабочых праз сялянскія камітэты і іншыя грамадскія арганізацыі ўдзельнічаюць у гэтым будаўніцтве.

Прайшло ўсяго толькі чатыры месяцы, а якія адбыліся велізарныя змены! Рабочыя і сяляне, не меўшыя раней ніякіх палітычных правоў, зараз атрымалі ўсе правы, сталі поўнапраўнымі гаспадарамі свайго жыцця. Яны—перанесшыя ўсе жахі капіталістычнай эксплаатацыі і хранічнага беспрацоўя—атрымалі права на працу, на адпачынак, на асвету на роднай мове. Упершыню за працоўнымі Заходняй Беларусі поўнасцю замацаваны неад'емныя правы на свабоду сходаў, свабоду друку, свабоду вулічных шэсцяў і дэманстрацый, свабоду слова.

Народ стаў сапраўдным гаспадаром свайго жыцця. Гіганцкую творчую работу разгарнуў разняволены народ пад кіраўніцтвам комуністаў праз свае часовыя ўпраўленні. Дакладная запіска старшыні часовага ўпраўлення Баранавіцкага павета тав. Касцюка ў ЦК КП(б) Беларусі ярка і пераканаўча ілюструе гэтую гіганцкую рабту. Дакладную запіску, як цікавы дакумент, прыводжу ніжэй поўнасцю:

«У Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі.

ІНФАРМАЦЫЯ

З чым ідзе да гадавіны Вялікага Кастрычніка Баранавіцкі павет.

Працоўныя Баранавіцкага павета, як і ўвесь працоўны народ Заходняй Беларусі, ідуць радасна і бадзёра, упершыню ў свабоднай абстаноўцы, да свайго вялікага рэвалюцыйнага свята—гадавіны Кастрычніка. За кароткі тэрмін пасля вызвалення ад капіталістычнага іга працоўныя Баранавіцкага павета атрымалі тое, што яны не маглі атрымаць за сотні год пры капіталізме.

I. ПРАЦОЎНЫЯ АТРЫМАЛІ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАВЫ.

У выбарах у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі было прадэманстравана з усёй сілай адвечнае імкненне працоўных да палітычнай улады. З 105 тысяч выбаршчыкаў па павету ў выбарах удзельнічала 98,99 проц. Галасавала за выстаўленых дэпутатаў 98 проц. Па 6 выбарчых акругах быў 100-процантны ўдзел і 100-процантнае галасаванне за кандыдатаў. Асноўная маса выбаршчыкаў — 80—90 тысяч з'явіліся да выбарчых урнаў для галасавання ў першыя дзве-тры гадзіны галасавання. У кіраўніцтве выбарамі членамі акруговых і ўчастковых выбарчых камісій прымалі ўдзел 2.905 чалавек рабочых, сялян і інтэлігенцыі. Усякія варожыя вылазкі з боку капіталістычных элементаў, памешчыкаў, асаднікаў, духавенства і іншых, якія выражаюцца ў закліку да зрыву галасавання, атрымалі рашучы адпор і пацярпелі поўны крах.

II. ПРАЦОЎНЫЯ АТРЫМАЛІ ПРАВА НА ПРАЦУ

З першых дзён прыходу ў Баранавічы, Чырвоная Армія і арганізацыі часовага ўпраўлення асноўным пытаннем сваёй работы паставілі клопаты аб забеспячэнні насельніцтва і прадастаўленні работы беспрацоўным. Польска-панская ўлада подла скрывала ад працоўных сапраўднае становішча ў гэтай галіне. Яна паказвала, што ў горадзе было беспрацоўных толькі 600 чалавек у той час калі нашай праверкай у першыя дні было ўстаноўлена больш 4000 чалавек беспрацоўных. Старая капіталістычная ўлада нават не збіралася ліквідаваць гэтае няшчасце для працоўных. Затое гэта зрабіла і робіць Савецкая ўлада. Мы з першых дзён разгарнулі ў горадзе і павеце вялікае будаўніцтва:

1) будуем у горадзе каменны будынак для сярэдняй школы на 400—500 чалавек навучаючыхся. Будаўніцтва падыходзіць ужо к канцу;

2) каменны будынак для сямігадовай школы;

3) будаўніцтва каменнага жылога дома;

4) дабудавалі адзін паверх дзяржаўнага банка;

5) адбудоўваецца 100 дамоў каменных і драўляных, пацярпеўшых ад бамбардыроўкі;

6) праклалі маставую на 2 вуліцах горада;

7) пабудавалі і замасцілі ў цэнтры горада перад упраўленнем вялікую і выдатную плошчу імені Леніна;

8) арганізаваны земляныя работы па пракладцы ад горада да валасцей шасейных дарог на адлегласці 90 клм;

9) ідзе будаўніцтва санаторыя для працоўных на 300—400 чалавек;

10) будуецца ў павеце 16 школ;

11) паслана 200 чалавек на вагатоўку дроў для горада;

12) арганізаван рад вытворчых арцелей і зараз арганізавалі мэблевую фабрыку, на якой будзе занята 400 чалавек рабочых;

13) зараз-жа пасля нацыяналізацыі кансервнай фабрыкі «Крэсэкспарт» арганізавалі 2-зменную работу замест аднazменнай, што дала работу дадаткова 150 рабочым.

Такім чынам, у нашым павеце і ў горадзе ўсе катэгорыі рабочых усіх спецыяльнасцей, тэхнікі і інжынеры атрымалі работу. Усяго занята на ўсіх відах будаўніцтва да 3.000 чалавек.

У горадзе не маюць работы старыя суддзі, пракурорска-следчыя чыноўнікі і ім падобныя, якія без перакваліфікацыі і наўрад ці атрымаюць работу.

Да ліквідацыі беспрацоўя 3.600 беспрацоўных атрымалі аднаразовую дапамогу.

III. ПРАЦОЎНЫЯ АТРЫМАЛІ ПРАВА НА АСВЕТУ

Асвета па нашаму павету стаяла на зусім нізкім узроўні. Сялянская моладзь школьнага ўзросту была ахоплена школай

(Працяг на 3-й стар.)

З'яднанне беларускага народа

(Праця г. Пачатак гл. на 2-й стар.)

толькі на 25 проц. і то на чужой мове. Сярэдняя школа—так званая гімназія была зусім недаступна для працоўных рабочых і сялян, бо кошт аплаты за вучэнне ў год абыходзіўся ў 500—700 злотых, а заработак сялянскай сярэдняй гаспадаркі ў год складаў не больш 100—150 злотых, чаго нехапала нават на пакрыццё шматлікіх капіталістычных падаткаў.

У першыя дні прыходу Чырвонай Арміі былі адкрыты ўсе школы, быў аб'яўлен новы набор ва ўсе ніжэйшыя і сярэднія школы горада і павета.

Дадаткова адкрыта на павету 37 новых школ і да 50 паралельных новых класаў.

Прынята дадаткова ў школы першай і другой ступені больш 10 000 дзяцей.

Прынята ў гімназіі горада дадаткова дзяцей працоўных 1.460 чалавек.

У адной жаночай гімназіі адкрыўся дадаткова 9-ты клас.

Зараз навучаецца ў школах горада і павета 35 291 вучань.

Атрымалі работу беспрацоўныя настаўнікі — 230 чалавек.

Усяго працуе зараз у горадзе і павеце 636 настаўнікаў.

Арганізаван упершыню інтэрнат у горадзе для дзяцей працоўных — усяго на 600 чалавек. Адкрыты новыя дзве гімназіі ў Ляхавіцкай і Крывашынскай валасцях.

Працуюць у горадзе 3-месячныя курсы па перападрыхтоўцы настаўнікаў па рускай і беларускай мовах, навучаецца на іх 120 чалавек.

Зменена вучэбная праграма школ у бок яе ідэйнага і акадэмічнага аздараўлення, выкінуты з праграмы прадметы рэлігійных культаў, гісторыя і дзяржаўны лад былой польскай дзяржавы і іншыя. Уведзены руская і беларуская мовы, канстытуцыя, палітграмата.

У горадзе адкрыты вячэрнія школы для дарослых на беларускай і рускай мовах, у якіх навучаецца больш 500 чалавек.

Усё навучанне працоўных узята на дзяржаўны кошт.

IV. ПРАЦОЎНЫЯ АТРЫМАЛІ ПРАВА НА АДПАЧЫНАК І АХОВУ ІХ ЗДАРОЎЯ

У павеце пры польскай уладзе на 184.000 насельніцтва была толькі адна гарадская больніца і ў вёсцы 7 урачоў у рэзультаце чаго ніколі не выводзіліся такія эпідэмічныя хваробы, як брушны і сыпны тыф, дызентэрыя і іншыя. Не было зусім санітарнай службы, усё лячэнне было прыватным і недаступна дарагім. У сярэднім кошт лякарства па аднаму рацэпту складаў 8—10 злотых, прычым не за кошт змесціва, а галоўным чынам за знешняе афармленне (карабок, абвёртка і т. п.).

Не было хуткай урачэбнай дапамогі і т. д.

Зараз становішча карэнным чынам змянілася:

1) гарадская больніца расшырана з 100 коек да 200;

2) адкрыта першая дзяржаўная амбулаторыя з аддзяленнямі — тэрапеўтычным, туберкулёзным, венерычным, вочным, гінекалагічным, хірургічным, два зубных кабінеты, рэнтген;

3) адкрыты 2 дзіцячых кансультацыі;

4) малочных кухань для дзяцей — 2;

5) фізіка-тэрапеўтычны кабінет;

6) лабараторыя;

7) арганізавана санітарная інспекцыя;

8) 5 урачоў вылучаны для абслугоўвання на даму;

9) рамантуецца і рыхтуецца памяшканне пад радзільны дом на 50 коек;

10) днямі адкрываецца 2-я амбулаторыя;

11) да гадавіны Кастрычніка адкрываем у Тартакскай і Навамышскай валасцях — у 10 кілометрах ад горада туберкулёзны санаторый на 100 коек;

12) у чатырох валасцях: Малчадскай, Гарадзішчанскай, Остроўскай і Ляхавіцкай адкрыты больніцы на 15—20 месц у кожнай;

13) з 73 зарэгістраваных беспрацоўных урачоў атрымалі работу 66 урачоў. Апрача таго, атрымалі работу таксама 10 фельчароў, 7 зубных урачоў, 12 акушэрак, 27 медсясцёр;

14) у павеце працуе дэзатрад па апрацоўцы ачагоў эпідэмічных захворванняў;

15) арганізавалі ў горадзе тры дзяржаўныя аптэкі і аптэкарскі склад.

Усё лячэнне працоўных праводзіцца за дзяржаўны кошт.

V. СЯЛЯНЕ АТРЫМАЛІ ЗЯМЛЮ

Пры капіталістычнай памешчыцка-панскай уладзе 50 проц. усіх зямельных угоддзяў належала 175 памешчыкам і 250 асаднікам. Астатняя палавіна значна горшых угоддзяў належала 36.670 сялянскім гаспадаркам. Каля 70 проц. сялянскіх двароў мела зямельны надзел да 3 га ўсіх угоддзяў.

Зараз усе памешчыцкія землі раздзелены паміж сялянамі. 3 987 беззямельных сялян надзелены зямлёй, астатняя зямля раздзелена сярод малазямельных.

3.110 бескароўных гаспадарак надзелены каровамі.

1.360 гаспадарак, не меўшых коней, надзелены коньмі.

Выдана бяднейшым малазямельным сялянскім гаспадаркам 1.110 свіней, 25.000 цнт. хлеба, больш 8.000 тон бульбы, 50 тон яблык і т. д.

Племянная жывёла, якая мелася ў маёнтках, захавана.

На тэрыторыі павета арганізаван разам з ваенным ведамствам конскі завод, у якім ёсць да 1.320 племянных чыстакроўных коней.

Забаронена рассяленне на хутарах. У цэлым радзе валасцей хутарскія сяляне ссяляюцца ў вёскі.

VI. АБ ЗАБЕСПЯЧЭННІ ПРАЦОЎНЫХ

Асабліва цяжкім участкам работы—гэта было забеспячэнне горада прадуктамі, бо паляки вывезлі з горада абсалютна ўвесь хлеб і іншыя прадукты. З першых жа дзён быў створан свой загатоўчы апарат, праведзена вялікая раз'ясніцельная работа сярод сельскага насельніцтва. За гэты час было арганізавана і дастаўлена ў горад каля 6.000 падвод розных сельскагаспадарчых прадуктаў—хлеба 560 тон, жывёлы рознай 763 штукі—1.350 цнт. Створан рэзерв хлеба. Цалкам ліквідаваны чаргі на хлеб і на мяса.

У рэзультаце раз'ясніцельнай работы цэны ў апошнія дні на сельскагаспадарчыя прадукты значна панізіліся. Намеціўся значны прыток у апошнія дні сялян на базары. Загатоўлена ільновалакна 41 тона. Адкрыты тры рабочых каапэратывы на чыгунцы і 16 ларкоў у горадзе. 3 дзяржаўныя сталовыя і падрыхтоўваецца адкрыццё універмага і харчмага.

VII. КУЛЬТУРНА-БЫТАВОЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ПРАЦОЎНЫХ

У горадзе нармальна працуюць 2 кіно. Арганізаван пастаянны дзяржаўны тэатр. На чыгунцы і на кансервнай фабрыцы арганізаваны рабочыя клубы. Электрастанцыя працуе ўвесь час нармальна, гарадскія лазні таксама. Арганізаван свой аўтатранспарт. У горад завезена і прадана ўжо школам, больніцам, установам і прадпрыемствам больш 5.000 кубаметраў дроў, а ўсяго загатоўленых ёсць да 30.000 кубаметраў.

VIII. У ГАЛІНЕ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ГОРАДА

Цалкам адноўлены ўсе фабрыкі, прадпрыемствы, якія польскімі ўладамі былі закрыты. Многія з іх пераводзяцца на двухзменную работу. Нацыяналізаваны ўжо адна кансервная фабрыка, 4 лесаапрацоўчых заводы, 4 буйных паравых млыны і інш.

На кіраўніцтва нацыяналізаванымі прадпрыемствамі высоўваюцца лепшыя людзі з мясцовых рабочых і сялян.

У рэзультаце палепшання работы ў прамысловасці з зарэгістраваных па гораду і павету 120 беспрацоўных інжынераў і 380 тэхнікаў і майстраў у даны момант усе яны атрымалі работу.

Аб чым і паведамляю да Вашага ведама.

Старшыня часовага ўпраўлення горада Баранавічы і павета — Касцюк".

Гэты дакумент — жывая ілюстрацыя творчай актыўнасці, невычарпальнай энергіі вызваленага народа. Падобныя выдатныя прыклады, паказваючыя найглыбейшыя зрухі і рэвалюцыйныя пераўтварэнні, якія робяцца самім народам пад кіраўніцтвам камуністаў, пасланцоў партыі Леніна—Сталіна, ёсць паўсюдна, у жыцці кожнай вобласці, кожнага раёна.

У працоўных заходніх абласцей Савецкай Беларусі нараджаюцца новыя адносіны да працы, якія базіруюцца на пачуцці новага, на свядомасці рабочага, стаўшага гаспадаром вытворчасці. Рабочыя ў першыя-ж дні работы нацыяналізаваных прадпрыемстваў значна павялічылі прадукцыйнасць працы.

На тэкстыльных фабрыках Беластока за першыя дні работы без фабрыкантаў прадукцыйнасць працы павысілася на 30 — 35 проц. Рух за пад'ём прадукцыйнасці працы зараз пачынае ахапляць рабочых усіх прамысловых прадпрыемстваў Заходняй Беларусі. Гэты рух набывае велізарнейшае палітычнае значэнне.

Рабочыя Заходняй Беларусі ў рэзультаце гістарычнага вопыту і на прыкладзе Савецкага Саюза вельмі добра разумеюць, што „капіталізм можа быць канчаткова пераможан і будзе канчаткова пераможан тым, што соцыялізм стварае новую куды больш высокую прадукцыйнасць працы" (Ленін).

Пачын беластоцкіх тэкстыльшчыкаў, пачаўшых рух за пад'ём прадукцыйнасці працы, высунуўшых лозунг ператварэння Беластока ў другое Іванава, з'яўляецца яркім выражэннем далучэння шырокіх народных мас Заходняй Беларусі да будаўніцтва соцыялізма.

Перад Заходняй Беларуссю, краіне адсталай у прамысловых і тэхнічных адносінах з адсталай сельскай гаспадаркай, наступае час бурнага прамысловага і сельскагаспадарчага развіцця. Побач з рэканструкцыяй існуючых прамысловых прадпрыемстваў павінны ўзнікнуць ва ўсіх абласцях і раёнах, у рэзультаце праяўлення мясцовай ініцыятывы, прадпрыемствы мясцовай будаўнічай, харчовай, керамічнай, лесаапрацоўчай і іншай прамысловасці, прадназначанай для абслугоўвання патрэб насельніцтва.

Заходняя Беларусь валодае першакласнымі транспартнымі воднымі артэрыямі (рэкі Прыпяць, Буг, Неман, Шара, Мухавец, Вілейка, каналы Днепра Бугскі, Днепра Неманскі і Аўгустоўскі), якія ў рэзультаце драпежніцкай каланізатарскай палітыкі польскіх улад у адносінах да Заходняй Беларусі паступова хірэлі.

Першаступеннай задачай партыйных і савецкіх органаў усяго народа заходніх абласцей Беларусі з'яўляецца аднаўленне і развіццё гэтых шляхоў зносін, дапаўняючых чыгуначны транспарт, маючых велізарнае эканамічнае значэнне, даючых магчымасць дастаўляць па таннаму воднаму шляху вырабы і прадукты саюзнай прамысловасці ў Заходнюю Беларусь, а таксама даючых выхад заходнебеларускаму лесу.

Адной з грандыёзнейшых задач, якія стаяць перад беларускім народам, з'яўляецца задача асушэння Беларускага Палесся. На працягу стагоддзяў на гэтым краі ляжала пячаць жабрацтва і голаду. Гэты край лічыўся „забытым богам і людзьмі краем". Пасля асушэння балот Палессе ператворыцца ў цудоўнейшы пладародны край. Палессе мае рэкі, шляхі зносін, мае лес і будзе мець пладароднейшыя землі. Гэты край зацвіце, зажыве новым, поўнакроўным, багатым жыццём. Справа чэсці беларускага народа — вырашыць гэтую праблему так, як, скажам, узбекі вырашылі праблему вады будаўніцтвам Вялікага Ферганскага канала.

Перад Савецкай Беларуссю стаіць задача — разбудзіць спячыя нетры зямлі заходніх абласцей, разведаць, устанавіць і здабыць карысныя выкапні. Сяляне — заходнія беларусы — гавораць, што ля Друскенікаў павінна быць нафта, на поўдні Палесся таксама павінна быць нафта. Гэты пункт погляду падтрымліваюць і вучоныя, якія лічаць, што ў Беларускім Палессі, у тым ліку ў Глускім раёне, павінны быць пласты нафты, якія з'яўляюцца прадаўжэннем пластоў украінскай, драгабыцкай нафты.

Сяляне гавораць, што каля Брэста яны бачылі буры вугаль, у раёне Гродна — вельмі добрыя будаўнічыя матэрыялы, расказваюць аб вялікіх залежах фасфарытаў і іншых карысных выкапняў.

Даследванне месцараджэнняў, каб як можна больш атрымаць мясцовых відаў паліва, будматэрыялаў, з'яўляецца сур'ёзнейшай нашай задачай.

У Заходняй Беларусі ўсе электрастанцыі працуюць на цяжкіх відах паліва. Польскія каланізатары ігнаравалі скарыстанне багацейшых і танных мясцовых энергетычных рэсурсаў. Вырашэнне энергетычнай праблемы — адна з самых важных і неадкладных задач. Невялікай і сярэдняй магутнасці электрастанцыі на базе мясцовых тарфяных масіваў і невялікай і сярэдняй магутнасці гідраэлектрастанцыі на шматлікіх рэках павінны ў энергетычных адносінах зусім пераўтварыць аблічча заходніх абласцей Беларусі і паставіць работу яе прамысловасці на больш высокую тэхнічную аснову.

Сельская гаспадарка мае ў перспектыве задачу тэхнічнага ўзбраення, ліквідацыю церасапалосіцы і нізкіх ураджаяў шляхам прымянення комплекса агратэхнічных мерапрыемстваў — адным словам, задача заключаецца ў ператварэнні адсталай сельскай гаспадаркі ў перадавую сельскагаспадарчую вытворчасць, дастойную вялікай Савецкай краіны.

Перад працоўнымі заходніх абласцей Беларусі адкрыты велізарныя магчымасці для развіцця беларускай нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу культуры і мастацтва. Зараз ужо стаіць перад усімі савецкімі, партыйнымі органамі задача стварэння сеткі ніжэйшых, сярэдніх школ і вышэйшых навучальных устаноў, бібліятэк, клубаў, хат-чытальняў, тэатраў, кінотэатраў, музыкальных і мастацкіх устаноў, арганізацыя выдавецтваў па выпуску кніг і брашур аб поспехах соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР, па гісторыі нашай партыі, рускіх і беларускіх класікаў на мовах народаў, насяляючых Заходнюю Беларусь.

Для больш паспяховага вырашэння гэтых і цэлага раду іншых задач ліквідаван стары адміністратыўны падзел на паветы, які быў выгодным у свой час польскім уладарам, бо ён аддаляў іх ад народа, з якім улады не хацелі мець нічога агульнага. Зараз праведзен новы адміністратыўны падзел. Каб наблізіць органы ўлады да насельніцтва, створаны раёны з раённымі Саветамі дэпутатаў працоўных, а на сяле — сельскія Саветы дэпутатаў працоўных.

Працоўныя Заходняй Беларусі зараз знаходзяцца напярэдадні вялікіх гістарычных падзей — перад пачаткам выбарчай кампаніі па правядзенню выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР. Як поўнапраўныя грамадзяне вялікага Савецкага Саюза яны пашлюць у Вярхоўныя Саветы сваіх лепшых прадстаўнікоў, верных сыноў народа. Выбранне ў Вярхоўныя Саветы СССР і БССР прадстаўнікоў вызваленых народаў Заходняй Беларусі з'явіцца ярчэйшым выражэннем новых перамог ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, перамог генеральнай лініі бальшэвіцкай партыі, новым сведчаннем празорлівасці і мудрасці нашага вялікага правадыра таварыша Сталіна, якому беларускі народ абавязан сваім вызваленнем і з'яднаннем у адзінай беларускай дзяржаве.

У дружнай сям'і ўсіх народаў магутнага Савецкага Саюза адзіны беларускі народ пойдзе ў першых радах пад сцягам бальшэвіцкай партыі, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна да поўнай перамогі камунізма.

Журнал «Партыйнае будаўніцтва».

Аб учоце паспяховасці вучняў

(Да ўвагі метадычных нарад настаўнікаў)

У пастанове ЦК ВКП(б) аб школе сказана:

„У аснову ўчоту школьнай работы павінен быць пакладзен бягучы індывідуальны, сістэматычна праводзімы ўчот ведаў вучняў. Выкладчык павінен у працэсе вучэбнай работы ўважліва вывучаць кожнага вучня. На аснове гэтага вывучэння выкладчык абавязан у канцы кожнай чвэрці складаць характарыстыку паспяховасці кожнага вучня па данаму прадмету".

Сістэматычны, індывідуальны і глыбокі ўчот паспяховасці дае магчымасць праверыць і ацаніць работу настаўніка, галоўнае ж ён мае выхаваўчае і стымуліруючае значэнне для вучня. Калі вучань упэўнен, што яго работа, яго веды будуць праверана і ацэнены, ён будзе старацца вучыцца лепш, учот абуджае вучня да глыбокай, сур'ёзнай і сістэматычнай работы над сабой.

На жаль, гэтага не разумеюць у некаторых школах нашай вобласці. У сувязі з адсутнасцю новай дакументацыі (класныя журналы і дзённікі вучняў) у радзе школ яшчэ не вядзецца бягучы ўчот паспяховасці вучняў. Некаторыя настаўнікі зусім не пытаюць у вучняў папярэдні матэрыял, а некаторыя, хоць і праводзяць беглае апытанне, але не ставяць адзнакі ў журнал. Пытанне ўчоту паспяховасці для многіх настаўнікаў яшчэ няясна.

Якія асноўныя характэрныя рысы ўчоту паспяховасці ў школе?

Учот павінен быць сістэматычны. А гэта значыць, што на кожным уроку, незалежна ад яго характару, мае месца ў той ці іншай форме праверка ведаў вучняў.

Учот павінен быць глыбокім. А гэта значыць, што настаўнік карыстаецца рознымі метадамі праверкі ведаў вучняў (вуснае апытанне, пісьмовая кантрольная работа, выклік з месца, выклік да дошкі, праверка дамашняй работы). Пры ўчоце паспяховасці нельга карыстацца праверкай аднаго боку ведаў вучняў, прыкладна, па гісторыі — толькі храналогіі, па геаграфіі — ведання карты і т. д. Наадварот, трэба правяраць розныя бакі вучэбнага матэрыялу. Напрыклад, па гісторыі настаўнік правярае ўменне звязна расказаць матэрыял, запамінанне дат і гістарычных дзеячоў, веданне асноўных фактаў, разуменне прычын, якія выклікалі гэтыя факты, уменне правільна фармуліраваць вывады, выцякаючыя з фактаў і г. д.

Учот павінен быць індывідуальны. Гэта не значыць, канешна, што слабейшаму вучню трэба ставіць больш лёгкае пытанне. Гэта значыць, што адных вучняў настаўнік правярае часцей, другіх радзей. Пры апытанні настаўнік не толькі канстатуе, ці ведае вучань вучэбны матэрыял, але і дэталёва вызначае ступень ведаў вучня.

Учот павінен быць аб'ектыўным і дакладным. У некаторых школах яшчэ наглядаецца шкодная практыка ў ацэнцы ведаў, якая грунтуецца на контррэвалюцыйных „тэорыях" ілжэнавукі педалогіі. Выходзячы з гэтых „тэорый", настаўнікі больш здольным вучням ставяць лепшыя адзнакі нават за слабейшы адказ. З такой практыкай трэба павесці рашучую барацьбу, бо яна прытупляе імкненні і жаданні вучняў да заняткаў, паколькі кожны з іх як-бы абрачон на атрыманне адных і тых-жа стандартных ацэнак.

Вопыт работы савецкіх школ паказвае, што ў аснову крытэрыяў ацэнак неабходна пакласці: 1) аб'ём ведаў вучняў, які вызначаецца вучэбнай праграмай; 2) ступень разумення і моцнасць засваення набытых ведаў; 3) уменне прымяняць набытыя веды і 4) колькасць і характар памылак.

Куставыя метадычныя аб'яднанні і секцыі настаўнікаў, павінны разглядзець пытанне аб учоце паспяховасці вучняў і ў прыватнасці аб крытэрыях ацэнак.

Тэляс.



Група рабочых прадпрыемстваў Беластока, якія скончылі курсы агітатараў пры гаркоме партыі. Злева направа: М. В. Плашкевіч, С. В. Мацейчук, А. О. Ялушэўскі і Л. О. Вельфгант.

ВОЙНА В ЗАПАДНОЙ ЕВРОПЕ

Париж, 10 февраля. В опубликованном вчера вечернем официальном коммюнике говорится: «На участке фронта между Мозелем и Сааром артиллерия обеих сторон действовала значительно активнее. Вылазка противника была отбита».

В утреннем коммюнике сказано, что «на фронте не произошло ничего нового».

Брюссель, 10 февраля. В военном обзоре газеты «Журналь» говорится: «Наступившая оттепель в восточных районах подняла уровень воды на Рейне почти на три метра.

В связи с этим на ответвлениях линии Мажино и Зигфрида производятся работы, необходимые для предотвращения возможного сильного наводнения. На море, за исключением потопления одного корабля, немецкой подводной лодкой, ничего особенного не произошло. Немецкие самолеты производили полеты над английскими берегами».

—o—

АМЕРЫКАНСКІ ЖУРНАЛ АБ ВАЕННЫХ МЭТАХ АНГЛА-ФРАНЦУЗСКАГА БЛОКА

Амерыканскі журнал „Ньюс уік" апублікаваў артыкул аб ваенных мэтах заходніх дзяржаў. Артыкул суправаджаецца картай, на якую нанесен план раздзелу Германіі „ў выпадку, калі Англія і Францыя вый дуць пераможцамі з гэтай вайны." Ваеннай мэтай заходніх дзяржаў, гаворыцца ў артыкуле, з'яўляецца раздрабленне Германіі. У саставе Германіі павінны застацца толькі невялікія часткі некаторых яе абласцей. Назвы Германія і Прусія павінны знікнуць. Астатнія часткі Германіі павінны быць падзелены паміж саюзнікам і другімі дзяржавамі, якія знаходзяцца пад іх уплывам

(ТАСС).

Отмена запрета на вывоз оружия только удлинит сроки войны и втянет в войну Соединенные Штаты Америки. (Из газет).



АМЕРИКАНСКАЯ РЕПКА.

Дедка за репку, бабка за дедку...
Рис. Ц. Лисевича.
(Фотохроника ТАСС)

РУХ ПРАЦОЎНЫХ СУПРОЦЬ ДАПАМОГІ БЕЛАФІНАМ

У ЗША

У ЗША шырыцца рух супроць аказання дапамогі белафінам. Па паведамленню газеты „Дэйлі уоркер," у горадзе Балтыморы многія арганізацыі, у тым ліку мясцовы совет профсаюзаў, выступілі супроць аказання матэрыяльнай дапамогі бела-Фінляндыі. Такія-ж рэзалюцыі прынялі профсаюз металістаў у Чыкаго, а таксама профсаюзныя арганізацыі і група відных прадстаўнікоў інтэлігенцыі ў горадзе Цынцынаці.

Аб настроі шырокіх мас амерыканскага народа сведчыць таксама анкета, якая распаўсюджвалася газетай „Бікон джорнэл" у буйным цэнтры гумавай прамысловасці — горадзе Экрон. 88 проц. асоб, адказаўшых на пытанні, пастаўленыя ў анкеце, выказаліся супроць аказання дапамогі белафінам. У Галібудзе мясцовы профсаюз музыкальных работнікаў адхіліў прапанову аб афяраванні 400 долараў у фонд гувераўскага камітэта дапамогі бела-Фінляндыі.

У ШВЕЦЫІ

Радавыя члены шведскіх профсаюзаў усё часцей і больш рашуча асуджаюць раскольніцкую дзейнасць кіраўнікоў соцыял-дэмакратыі, якія імкнуцца скарыстаць у сваіх мэтах профсаюзны рух. Рабочыя буйнейшых профсаюзных арганізацый Усходняй Швецыі пераважнай большасцю галасоў выказаліся супроць аказання дапамогі манергеймаўскім бандам.

Профсаюзны сход самай буйнай у Швецыі судабудаўнічай верфі — Гэта — адверг прапанову соцыял-дэмакрата Свенсона аказаць дапамогу белафінскаму „ураду." Выступіўшыя на сходзе рабочыя выкрылі сапраўдныя мэты кампаніі дапамогі бела Фінляндыі.

На гэтым-жа сходзе рабочыя правалілі спробу рэфармісцкага кіраўніцтва профсаюзаў выключыць з профсаюза комуністаў і другіх рэволюцыйных рабочых. 3.900 членаў профсаюза, прымаўшых удзел у сходзе, толькі 100 чалавек галасавала за прапанову соцыял-дэмакратаў.

Сход аднадушна прыняў рэзалюцыю, у якой гаворыцца: „Мы выказваем нашы гарачыя сімпатыі фінскаму працоўнаму народу і ўпэўнены, што хутка настане дзень, калі ён назаўсёды вызваліцца ад сваіх прыгнятальнікаў, ад банд Манергейма. Мы гатовы прадаставіць усё,што ў нас ёсць, фінскаму рабочаму класу і Народнаму ўраду, але ў нас не знойдзецца ніводнага эрэ белагвардзейскім катам, якія спальваюць фінскія вёскі і насільна выганяюць мірнае насельніцтва з сваіх родных месц. Мы самым рашучым чынам пратэстуем супроць дзікай антысовецкай кампаніі, якая праводзіцца рэакцыяй, і супроць усякіх спроб соцыял-здраднікаў раскалоць шведскі рабочы клас".

В НОРВЕГИИ

Осло, 11 февраля.

Как сообщает «Арбейдерен», норвежские реакционеры пытаются организовать так называемую «трудовую» помощь белофиннам. Скандинавских рабочих хотят отправить в бело-Финляндию, чтобы заменить финнов, которые будут насильно рекрутироваться в маннергеймовскую армию.

В Норвегию прибыл специальный белофинский агент Лухокии, взывающий к своим северным «собратьям» о помощи.

Совместно с профбюрократами действуют и крупные норвежские промышленники, использующие все средства нажима, чтобы заставить занятых на их предприятиях рабочих выехать в бело-Финляндию. Безработных соблазняют при этом обещанием высокой зарплаты.

Возмущенные предательством профсоюзных лидеров, рабочие мельниц гор. Шиен приняли резолюцию, в которой заявляют резкий протест против проводящейся в стране разнузданной военной пропаганды. «Мы, — сказано в резолюции, — категорически требуем прекращения агитации за вербовку добровольцев в бело-Финляндию. Норвегия не должна разрешать транзита оружия и иностранных войск через свою территорию».

Аналогичную резолюцию приняли также союз плотников и столяров города Трондгейм.

(ТАСС)

* * *

7 лютага ў гор. Одда (Нарвегія) адбыўся сход аб'яднання хатніх гаспадынь. У рэзалюцыі, прынятай на сходзе, хатнія гаспадыні патрабуюць спынення дапамогі манергеймаўскай Фінляндыі. Яны заклікаюць змагацца супроць паклёпніцкай кампаніі, якую вядзе нарвежскі рэакцыйны друк супроць Совецкага Саюза.

(ТАСС)

Выступленне Чэмберлена ў парламенце

8 лютага ў англійскай палаце абшчын выступіў прэм'ер англійскага ўрада Чэмберлен. Гаворачы аб становішчы на заходнім фронце, Чэмберлен заявіў, што ў сувязі з моцнымі халадамі ў Еўропе за апошнія тыдні не адбылося ніякіх істотных падзей. У сваім выступленні Чэмберлен заявіў далей, што дапамога, аказаная англійскім урадам Фінляндыі, „прадстаўляе рэальную каштоўнасць для апошняй" і што прадпрыняты новыя шагі да далейшага аказання дапамогі Фінляндыі. Чэмберлен аправергнуў германскія паведамленні аб тым, што ў час налёту трэцяга лютага немцы патапілі не менш 9 англійскіх суднаў, якія канваіраваліся ваеннымі караблямі.

(ТАСС).

—o—

В ПОСЛЕДНИЙ ЧАС

БОЛГАРСКАЯ ПЕЧАТЬ О ПОЛИЦЕЙСКОМ НАЛЕТЕ В ПАРИЖЕ


София, 11 февраля (ТАСС). Болгарская печать помещает подробные сообщения о полицейском налете на советские учреждения в Париже. «Заря» под заголовком «Парижская полиция растоптала дипломатические традиции» пишет, что вопреки официальным об'яснениям мотивов полицейского налета, «в об'ективных политических кругах этот акт рассматривается как проявление грубого насилия полиции и нарушение дипломатических традиций».

—o—

ЛИТОВСКАЯ ПЕЧАТЬ О ПОЛОЖЕНИИ В БЕЛО-ФИНЛЯНДИИ

Каунас, 11 февраля (ТАСС). Газета «Лиетувос жиниос» в номере от 10 февраля пишет, что «вся финская армия перешла на окопную войну. Это значит, что Финляндия не имеет больше никаких резервов. Экономическое положение страны, несмотря на получаемую помощь от союзников, тяжелое. Солдаты финской армии деморализованы и измотаны постоянным пребыванием на фронте. Эта деморализация стала постоянным явлением в маннергеймовской армии. Силы финских солдат иссякли. Это хорошо понимают маннергеймовцы, и поэтому они стремятся пополнить свои резервы добровольцами из-за границы».

Советский Союз, пишет дальше газета, не сторонник молниеносной войны в Финляндии, так как ведение такой войны означало-бы уничтожение Финляндии. Советский Союз хочет, чтобы Финляндия осталась независимой страной и не служила плацдармом для борьбы против СССР.



На снимке: Лечение детей свежим воздухом во вновь открытой 1-й детской больнице г. Белостока. (Фотохроника БЕЛТА).

ПО ГОРОДУ И ОБЛАСТИ

СОВЕЩАНИЕ ДВУХСТАНОЧНИКОВ

9-го февраля в горкоме КП(б)Б состоялось совещание двухстаночников белостокских текстильных предприятий.

Двухстаночники в своих выступлениях обратили особенное внимание на помехи в деле успешного внедрения стахановских методов работы на предприятиях.

Так, например, на 29 фабрике и во втором комбинате двухстаночники почему-то работают на плохих станках в то время, когда одностаночники работают на лучших станках.

Выступавшие указывали, что некоторые инженеры и мастера не прислушиваются к рационализаторским предложениям передовиков производства (фабрика № 29, фабрика № 18 и др.).

К сожалению, на совещании не было представителей текстильного треста, которым следовало бы дать об'яснения по выдвинутым вопросам и принять во внимание замечания двухстаночников.

БЕЛОСТОКСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ИЗОМУЗЕЙ

В Белостоке не было музея изобразительных искусств. Управление искусств при Совнаркоме БССР организует в Белостоке государственный изомузей.

В новом музее будут собраны художественные ценности, находящиеся в Белостокской области (картины, скульптуры, фарфор, и т. д.).

У ХУДОЖНИКОВ

В марте в Белостоке состоится выставка художественных работ белостокских художников, членов оргруппы союза советских художников в Белостоке. Лучшие работы художников будут посланы в Москву на декаду белорусского искусства.

ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНАЯ ГАЗЕТА «ЗАПАДНАЯ МАГИСТРАЛЬ»

10 февраля вышел первый номер железнодорожной газеты «Западная магистраль» — орган политотдела и управления Белостокской железной дороги.

Передовая статья и вторая полоса первого номера посвящены выборам в Верховные Советы СССР и БССР. В газете помещены материалы об успехах железнодорожников Волковыского отделения дороги, о замечательном рекорде бригады вагонников тов. Орлова, выпустившей в честь выборов из среднего ремонта два товарных вагона за 3 часа, при норме 112.

Выходом новой газеты железнодорожники получили в свои руки могучее оружие в борьбе за дальнейший под'ем работы дороги, в борьбе за выполнение всех задач, поставленных большевистской партией, правительством, сталинским наркомом товарищем Л. М. Кагановичем.

Газета будет выходить через день тиражем в 6 тысяч экземпляров.

КИНО-ТЕАТРЫ ГОТОВЯТСЯ К ИЗБИРАТЕЛЬНОЙ КАМПАНИИ

Кинопередвижки Белостокского треста кинофикации дадут 593 сеанса для избирателей Белостокской области. Из этого числа 53 сеанса состоятся на фабриках и заводах, 90 сеансов — на избирательных участках и 450 — в селах и деревнях области.

Все кинопередвижки оформлены соответствующими лозунгами.

Кроме того, трестом кинофикации выделена одна агитмашина с киноустановкой, радиоустановкой, патефоном и гармонистом для обслуживания г. Белостока.

Адказны радактар
Б. М. Зельманаў

Кино-театр „СВОБОДА"
Вторая серия
„ВЕЛИКИЙ ГРАЖДАНИН"
сверх программы—концерт
Нач. в 6.30, 8.45 и 11 ч. (моск. вр.)
Касса открыта с 2 часов дня.

Кино-театр „СПАРТАК"
„Четвертый перископ"
Сеансы: 7, 9 и 11 (москов. вр.)
В фойе концерты оркестра

Кино-театр „Чырвоная Зорка"
2-ая серия „Детство Горького"
„В ЛЮДЯХ"
Сеансы: 5, 7, 9, 11 ч. (по моск. вр.)
Касса открыта с 2 час. (моск. вр.)

Кино-театр „РОДИНА"
„ТРАКТОРИСТЫ"
Сеансы: 5, 7, 9, 11. (моск. вр.)
Касса открыта с 2час. (моск. вр.)

Памяшканне гарадского тэатра
13, 14, 15 лютага
Адкрыццё гастролей другога Беларускага Дзяржаўнага драмтэатра Н. ПАГОДЗІН
„ЧАЛАВЕК З РУЖЖОМ"
п'еса ў 3-х актах
пачатак у 8 ч. вечара
Білеты прадаюцца з 12—2 і з 5—9 гадзін
Прымаюцца заяўкі на калектыўныя паходы.
Дырекцыя.

2-му Белорусскому Государственному театру требуются
комнаты для артистов.
Оплата по соглашению.
Адрес для предложений:
Городской театр, канцелярия.

БЕЛОСТОКСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ОТДЕЛ НАРОДНОГО ОБРАЗОВАНИЯ
об'являет НАБОР
учащихся на курсы учителей для начальной школы, на курсы учителей для НСШ и на курсы учителей СШ.
На курсы учителей для начальной школы, принимаются лица, окончившие повшехную школу 2-й и 3-й ступени, а также приравненные к ним школы.
На курсы учителей для НСШ и СШ принимаются учителя для переквалифицирования и повышения квалификации, а также лица, имеющие незаконченное и законченное высшее непедагогическое образование.
Срок обучения 6 месяцев.
Учащиеся обеспечиваются стипендией и квартирными.
Поступающие должны подать следующие документы:
а) заявление, б) подробную автобиографию, в) документы об образовании (подлинник), г) справку об имущественном и социальном положении, заверенную местными органами власти, д) метрическую справку, е) две фотографии и ж) справку врача о здоровьи.
Прием заявлений с 10 по 29 февраля 1940 года в помещении Облоно, здание Облисполкома, правое крыло, 2-й этаж.
Экзамены с 20-го февраля, по математике, физике, химии, географии и одному иностранному языку.
ОБЛОНО
г. Белосток.
108—2.

Требуются для белостокского хлебокомбината на постоянную работу специалисты-пекари
Обращаться о приеме на работу в контору хлебокомбината по ул. Советской, дом 56.
114-а

КОГИЗ
24 марта 1940 г.
ДЕНЬ ВЫБОРОВ
Поступила в продажу литература к выборам в Верховные Советы СССР и БССР.
1. СТАЛИН И. В. — О проекте Конституции Союза ССР (доклад на чрезвычайном VIII Всесоюзном с'езде Советов 25 ноября 1936 г.). Цена 30 коп.
2. СТАЛИН И. В. — Речь на предвыборном собрании избирателей Сталинского избирательного округа гор. Москвы 11 декабря 1937 г. в Большом Театре. Цена 10 коп.
3. Конституция (основной закон) Союза Советских Социалистических Республик. Цена 10 коп.
4. Положение о выборах в Верховный Совет СССР. Цена 10 коп.
5. Положение о выборах в Верховный Совет Белорусской ССР. Цена 10 коп.
6. О Конституции Союза ССР (сборник) Цена 65 коп.
ТРЕБУЙТЕ ЛИТЕРАТУРУ ПО ВЫБОРАМ ВО ВСЕХ КНИЖНЫХ МАГАЗИНАХ КОГИЗА.
Белосток: ул. Ленинская, 14. Тел. 11-74.
„ Советская, 2. „ 71.
„ Советская, 11 (б. Рынок).
Предварительные заказы принимаются по почте, телеграфу и телефону.

В ОТДЕЛ ОБ'ЯВЛЕНИЙ ЗВОНИТЕ по ТЕЛ. 16-10

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газэту прымае Саюздрук тэл. 5,14.
Упаўнаважаны абдліта № 153.
1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.